Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Песачанская базавая школа імя С.А.Умрэйкі»

# Праект арганізацыі валанцёрскай дзейнасці
# “Добрыя сэрцы”

*Каждый милосердный поступок - это ступень лестницы, ведущей к небесам.*

Генри Уорл Бичер

**Ідэя праекта**

Укараніць актыўныя, інтэрактыўныя, калектыўныя творчыя метады валанцёрскай дзейнасці, якія садзейнічаюць фарміраванню маральных каштоўнасных арыентацый навучэнцаў.

**Актуальнасць праекта**

У любой, нават эканамічна моцнай краіне, заўсёды ёсць людзі, якім патрэбна асаблівая дапамога з боку грамадства. Таму валанцёрскі рух і з'яўляецца той рэальнай сілай, якая наўпрост дапамагае тым, каму гэтая дапамога неабходна. А бескарыслівая праца на карысць грамадства збліжае людзей, робіць іх больш цярпімымі адзін да аднаго, змяншае жорсткасць і бездухоўнасць нашага сучаснага свету. Такім чынам, актуальнасць валанцёрскага руху для выхавання падрастаючага пакалення відавочная і бясспрэчная.

Валанцёрскі рух у сучаснай школе прадугледжвае ўдзел навучэнцаў у розных сацыяльна значных праектах і акцыях. Валанцёрскі рух мае вялікае маральна-выхаваўчае значэнне. Гэта гарантыя таго, што дзеці вырастуць адкрытымі, сумленнымі, у любую хвіліну гатовымі на бескарыслівую дапамогу блізкаму.

Таксама актуальнасць заключаецца ў адпаведнасці ідэі праекта патрабаванням сучаснага грамадства на выхаванне сацыяльна актыўнай асобы. Навучэнцы павінны адыгрываць актыўную ролю ў грамадстве і быць яго паўнапраўнымі ўдзельнікамі, самадастатковымі і сацыяльна арыентаванымі.

**Тэрміны рэалізацыі праекта**: 2023/2024 навучальны год.

**Удзельнікі праекта:** навучэнцы 4-7,9 класаў, педагогі, якія выконваюць функцыі класных кіраўнікоў 4-7,9 класаў.

**Кіраўнік праекта:** дырэктар, садзейнічае развіццю дзіцячага валанцёрскага руху ва ўстанове, каардынуе дзейнасць навучэнцаў і педагогаў.

**Змест і механізмы рэалізацыі**

У падлеткавым узросце складваюцца здольнасці да свабоднага мыслення і самастойнасці, а творчая дзейнасць, у тым ліку сацыяльная, становіцца рэальнай асобаснай патрэбай. Працэс выхавання актыўнасці павінен будавацца на аснове супрацоўніцтва, узаемнай павагі і даверу дарослых і дзяцей.

Дзіцячая сацыяльная ініцыятыва – гэта заўсёды ініцыятыва дарослых, падтрыманая дзецьмі, якая захапіла дзяцей. Дзякуючы дапамозе і кіраўніцтву дарослых дзеці сталеюць.

Змест сацыяльна-педагагічнага праекта садзейнічае фарміраванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі і стварае матывацыю на прынящце

актыўнай сацыяльнай ролі нават тых дзяцей, якія з-за шэрага прычын не маюць ярка выражаных лідэрскіх здольнасцей.

Праект дае магчымасць стварэння дзіцячага валанцёрскага руху і пераследуе асноўную **ідэю** - выхаваць пакаленне людзей, здольных дапамагчы, якія разумеюць, будуюць свае ўзаемаадносіны з людзьмі на прынцыпах павагі да чалавека.

Поспех школьнага валанцёрскага руху залежыць ад пазітыўнага стаўлення да дзіцячага валанцёрскага руху з боку дзяржаўных і грамадскіх арганізацый рознага ўзроўняў, аказанне арганізацыйнай і фінансавай падтрымкі дзейнасці валанцёрскіх атрадаў школы.

Валанцёр - новы тэрмін, але не новая з'ява ў грамадскім жыцці нашай краіны. У гісторыі педагогікі добра вядомы цімураўскі рух і грамадска карысная дзейнасць як аснова існавання дзіцячых і маладзёжных аб'яднанняў і арганізацый. Удзел у сацыяльна каштоўнай дзейнасці традыцыйна разглядаецца як дзейсны выхаваўчы сродак. Валанцёрская дзейнасць як праява міласэрнасці і чалавекалюбства існуе, і будзе існаваць да таго часу, пакуль захоўваецца патрэбнасць людзей у дапамозе і абмежаваны магчымасці дзяржавы задавальняць патрэбнасці грамадзян у сацыяльнай падтрымцы.

Валанцёрскі рух - гэта тое месца, дзе ў сумесных справах навучэнцы могуць набыць пазітыўны вопыт сацыяльнага сталення і сацыяльнай адказнасці .

**Мэта:**

апрабацыя новых форм арганізацыі занятасці навучэнцаў для развіцця іх самастойнай пазнавальнай дзейнасці, фарміравання асобасных і камунікатыўных якасцей.

Для дасягнення пастаўленых мэт неабходна рашэнне наступных **задач:**

сфарміраваць згуртаваны калектыў валанцёраў і выхаваць запатрабаванне ў іх да сацыяльна маральных дзеянняў;

арганізаваць узаемадзеянне школы з навакольным соцыумам праз стварэнне сацыяльна падтрымліваючых сувязей дзяцей і дарослых для дзяцей і сем'яў, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі;

стварыць умовы, якія садзейнічаюць аказанню пазітыўнага ўплыву валанцёраў на аднагодкаў пры выбары імі жыццёвых каштоўнасцяў;

выхоўваць культуру чалавечых адносін, дабрыню і павагу да людзей;

развіваць уменне ацэньваць паводзіны навакольных і ўласныя ўчынкі.

**Накірункі дзейнасці**

«Міласэрнасць». Арганізацыя пасільнай дапамогі адзінокім грамадзянам (уборка прыдамавой тэрыторыі, навядзенне парадку ў доме, купля прадуктаў).

"Экалогія". Выяўленне і пасільнае вырашэнне экалагічных праблем аг.Пясочнае, значных аб'ектаў на тэрыторыі Бабаўнянскага сельскага савета. (Добраўпарадкаванне, азеляненне).

"Творчасць". Фарміраванне сацыяльна-актыўнай пазіцыі дзяцей і падлеткаў, развіццё творчых здольнасцей. Выраб сувеніраў, арганізацыя святаў, канцэртаў для хворых з ДУ “Калінаўскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых  і інвалідаў”.

**Патэнцыялы развіцця**

Асвятленне дзейнасці праекта;

Публікацыі па праблемах валанцёрскага руху;

Прыцягненне бацькоў да правядзення розных мерапрыемстваў; Выкарыстанне інфармацыйных стэндаў, газет, плакатаў.

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі “Песачанская базавая школа імя С.А.Умрэйкі”
__________________С.К.Астрэйка
“_____”______________ 2023 г.

# Планаванне дзейнасці валанцёрскага руху

| № п/п | Назва мерапрыемства | Тэрмін правядзення | Адказныя |
|---|---|---|---|
| 1 | Выраб лістовак, буклетаў “Хто такія валанцёры?” | верасень | Прытула А.А. |
| 2 | Акцыя “Утульны двор – чысты двор” | кастрычнік | Класныя кіраўнікі 4-7,9 класаў |
| 3 | Акцыя “Хай гады будуць залатымі!” | да 01 кастрычніка | Касінская В.М. |
| 4 | Віншаванне настаўнікаў, ветэранаў педагагічнай працы | да 01 кастрычніка | Шнэйтар Г.У. |
| 5 | Канцэртная праграма “Дарагім, любым прысвячаецца” | да 14 кастрычніка | Касінская В.М. |
| 6 | Акцыя “Утульны дом – чысты дом” | лістапад | Класныя кіраўнікі 4-7,9 класаў |
| 7 | Канцэртная праграма для хворых з ДУ “Калінаўскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў” | да 03 снежня | Шнэйтар Г.У. |
| 8 | Удзел у акцыі “Чудеса на Рождество” | да 25 снежня | Касінская В.М. |
| 9 | Выраб паштовак, віншаванне з Новым годам і Калядамі | да 08 студзеня | Класныя кіраўнікі 4-7,9 класаў |
| 10 | Віншаванне воінаў-інтэрнацыяналістаў аг.Пясочнае | 15 лютага | Класныя кіраўнікі 4-7,9 класаў |
| 11 | Купля прадуктаў для састарэлых і адзінокіх людзей | На працягу 2023/2024 г. | Класныя кіраўнікі 4-7,9 класаў |
| 12 | Выраб сувеніраў і паштовак, віншаванне жанчын аг.Пясочнае з Міжнародным | 6-8 сакавіка | Класныя кіраўнікі 4-7,9 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | жаночым днём | | класаў |
| 13 | Экалагічны дэсант, уборка тэрыторыі брацкай магілы і помніка “Журботная маці” аг.Пясочнае | красавік | Класныя кіраўнікі 4-7,9 класаў |
| 14 | Экалагічныя дэсанты “Чысты лес”, “Чысты бераг р.Нёман” | красавік | Класныя кіраўнікі 4-7,9 класаў |
| 15 | Акцыя “Шануем і памятаем” | 7-9 мая | Класныя кіраўнікі 4-7,9 класаў |